Прыемнае з карысным

# ПА ЎРАЖАННІ І... БОРШЧ,

## або Культурна-кулінарнае падарожжа

**Ідэя вандроўкі па Украіне з'явілася ў нас з сябрамі даўно. Для беларусаў гэта адзін з самых танных і, напэўна, цікавых варыянтаў: візы не трэба, ведання замежных моў — таксама. Мы вырашылі ахапіць адной паездкай максімум: сталічны Кіеў, марскую Адэсу і гістарычны Львоў. А пасля вяртання дзелімся сваімі ўражаннямі і практычнымі парадамі з чытачамі «Чырвонкі. Чырвонай змены».**

*Першае, аб чым трэба загадзя паклапаціцца любому «дзікаму» турысту, — месца жыхарства. Самым танным варыянтам будуць хостэлы. Пакой для траіх на дзве ночы ў Кіеве мы знялі прыкладна за 25 рублёў з чалавека, чатыры ночы ў аналагічным па фармаце пакоі ў Адэсе абышліся кожнаму ў 40 рублёў. Сумарна за начлег у двух гарадах заплацілі 65 рублёў — нават у самых танных гасцініцах за гэтыя грошы можна было б спыніцца толькі на суткі.*

*Наступнае пытанне — транспарт. Найбольш танны спосаб дабрацца да сталіцы Украіны — аўтобус. Квіткі на рэйсы «Мінсктранса» каштуюць 30 рублёў, трохі даражэй бяруць прыватныя перавозчыкі. Мы скарысталіся паслугамі апошніх і заплацілі 38 рублёў.*



У адкрыцці Львоўскага опернага тэатра ў 1900 годзе прымаў удзел славуты польскі пісьменнік беларускага паходжання Генрык Сянкевіч.

Кіеў — горад вельмі цікавы для беларусаў. Тут нямала звязанага з нашай краінай. Нават пакідаючы за дужкамі відавочную тапаніміку (ёсць Беларуская вуліца, станцыя метро «Мінская»), месцаў, якія нагадваюць пра Бацькаўшчыну, хапае. У былым мястэчку Прадславіна (цяпер гэта амаль цэнтр горада) некалі жыла беларуская князёўна Рагнеда, якую сілай забраў са спаленага Полацка князь Уладзімір. Пасля ў Кіеве некалькі месяцаў княжыў яшчэ адзін палачанін — Усяслаў Чарадзей. А ў Кіева-Пячэрскай лаўры больш як сем стагоддзяў захоўваліся мошчы святой Ефрасінні Полацкай. Ужо ў мінулым стагоддзі горад даў прытулак юнаму Уладзіміру Караткевічу (некалькі месяцаў у 1944 годзе ён знаходзіўся тут у сваякоў, а пасля прыехаў на вучобу). Цяпер за тры хвіліны хады ад двара, дзе жыў будучы класік, побач з будынкам беларускага пасольства яму ўсталяваны помнік.

*Самы просты спосаб дабрацца з Кіева да Адэсы — цягнік. Можна выбраць фірменны «Чарнаморац», купэ ў якім абыдзецца прыкладна ў 40 рублёў, а можна крыху сэканоміць — квіткі на звычайны рэйс каштуе каля 30 рублёў (дарэчы, чыгуначныя перавозкі — адна з рэдкіх паслуг, якія ва Украіне каштуюць даражэй, чым у нас). Мы выбралі апошні: начная паездка — выдатны спосаб сэканоміць час. Дванаццаць гадзін у цягніку — і вось мы ў легендарным партовым горадзе.*

Адэса лічыцца турыстычным цэнтрам у першую чаргу дзякуючы мору. Але калі вы трапіце сюды не падчас «сезона», то ўсё адно не засумуеце (а ў нечым нават выйграеце). Цэнтральную частку горада можна без перабольшвання назваць музеем пад адкрытым небам. Дастаткова зрабіць колькі крокаў ад вакзала — і вось вы на Малой Арнавуцкай вуліцы (той самай, дзе па версіі Астапа Бэндэра робяць усю кантрабанду), калі пайсці налева — патрапіце на легендарны рынак Прывоз (цяпер ён, праўда, не нашмат адрозніваецца ад нашых Ждановічаў, але візіт варта нанесці толькі дзеля яго асаблівай аўры). Адэскі оперны тэатр 1887 года пабудовы, вуліца Дзрыбасаўская, якую нават не трэба прадстаўляць, Пацёмкінская лесвіца, з вяршыні якой адкрываецца шыкоўны від на порт, славутыя катакомбы, агульная даўжыня якіх перавышае — удумайцеся — 2,5 тысячы кіламетраў (падчас вайны тут даволі паспяхова дзейнічаў атрад савецкіх партызан), Адэская кінастудыя, дзе ствараліся дзясяткі стужак, якія ўжо сталі класікай... Дарэчы, нямала тут і славутасцяў, звязаных з беларусамі. У горадзе ёсць помнік і памятная шыльда Адаму Міцкевічу (паэт жыў на Дзрыбасаўскай некалькі месяцаў і нават прысвяціў гораду цыкл сваіх санетаў), тут у 1917 годзе знаходзіўся адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай мовы Сцяпан Некрашэвіч (яго намаганнямі ў Адэсе тады запрацавала 30 пачатковых беларускіх школ), тут нарадзіўся класік нашай літаратуры Янка Брыль.

*Апошнім пунктам вандроўкі стаў Львоў — горад, які цяпер перажывае сапраўдны турыстычны «бум». Асабліва яго любяць нашы суайчыннікі — тут захавалася шмат заходнееўрапейскай архітэктуры, якая амаль не дажыла да нашых дзён у Беларусі. З Адэсы да Львова штодзень ходзіць начны цягнік, купэ ў якім каштуе каля 30 беларускіх рублёў у эквіваленце.*

У сталіцы Заходняй Украіны мы правялі ўсяго адзін дзень. Але нават гэтага дастаткова, каб атрымаць уражанне аб горадзе. Галоўнае, у чым пашанцавала Львову, — захаванне аўтэнтычнага архітэктурнага аблічча. Прычым не толькі ў гістарычным цэнтры, але і на значнай адлегласці ад яго. Першае месца, якое варта наведаць, — плошча Рынак і яе ваколіцы. Тут знаходзіцца гарадская ратуша, пад'ём на вежу якой рэкамендуецца толькі загартаваным турыстам — 60 метраў уверх па драўлянай лесвіцы адолее не кожны. Тут жа можна пасядзець у адной са шматлікіх кавярняў і набыць украінскія сувеніры. Абавязковае для наведвання аматарамі гісторыі месца — Музей Арсенал, дзе сабрана калекцыя разнастайнай зброі з больш як трыццаці краін свету: ад тэўтонскіх мячоў і татарскіх шчытоў да марцір, якія стралялі 30-кілаграмовымі ядрамі, і дуэльных пісталетаў. Калі вы раптам стаміліся ад падарожжа і людскога натоўпу, абавязкова наведайце Стрыйскі парк, які лічыцца адным з найпрыгажэйшых ва Украіне. Ёсць тут і звязаныя з Беларуссю славутасці, напрыклад палац Сапегаў — вядомага шляхецкага роду ВКЛ. З той прычыны, што мы не паспявалі паглядзець на ўсё, што запланавалі, вырашылі пайсці самым простым шляхам — падняліся на Замкавую гару, адкуль адкрываецца шыкоўны від на цэнтр Львова. Пабачылі ўсё за адзін раз, няхай і з вялікай адлегласці.



Наведаць Кіеў варта хоць бы дзеля помніка Уладзіміру Караткевічу.

*Самы эканомны спосаб вяртання ў Беларусь — паездка на прыгарадных цягніках з перасадкамі. Па вечарах ад Львоўскага вакзала адпраўляецца «дызель» на Ковель, квіток на які каштуе каля 2 рублёў, праз гадзіну пасля яго прыбыцця стартуе «дызель» у беларускі памежны аграгарадок Хаціслаў. Кошт білета — каля 1 рубля. Праз гадзіну цягнік ужо знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, і пасля памежнага нагляду можна перасаджвацца з яго ў электрычку Хацiслаў — Брэст, якая чакае на суседнім пуці (квіток коштам 1 рубель можна набыць проста ў вагоне ў кантралёра, ісці ў білетныя касы не трэба). Такім чынам, паездка са Львова ў Брэст будзе каштаваць усяго 4 беларускія рублі.*

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

### Лічыльнік

**Галоўнае, што прыемна здзіўляе ва Украіне, — цэны. Па большасці пазіцый яны меншыя за беларускія. Асабліва гэта адчуваецца ва ўстановах харчавання. Рознага кшталту стрыт-фуд (шаўрму, фалафель, бургеры і іншае) нам даводзілася каштаваць толькі праз уласную цікаўнасць, а не ў мэтах эканоміі. Сярэдні кошт абеду ў тутэйшай кавярні — 15 рублёў. За восем дзён падарожжа яныператвараюцца ў 120. Дадаём сюды вулічныя «перакусы» і ласункі і атрымліваем бюджэт на харчаванне каля 150 рублёў. У кожным горадзе варта пакаштаваць штосьці сваё: у Кіеве — боршч з пампушкамі (ці параўнаць мясцовыя дзеруны з нашымі дранікамі), у Адэсе — абавязкова ўзяць мясцовай цюлькі, у Львове — каву і дэсерты. Асобна варта сказаць пра порцыі — дзе-дзе, а ў кухонным пытанні шчодрасць украінцаў праяўляецца вельмі яскрава.**

Нябліжкі свет

# ВОСТРЫ «СМАК» КАРЭІ

**У наш час усё большую папулярнасць набірае такая форма навучання, як студэнцкі абмен. Вучыцца за мяжой — мара многіх, але спраўдзіць яе пакуль што могуць адзінкі. Студэнтка пятага курса Інстытута журналістыкі БДУ Ганна ВАСІЛЕЎСКАЯ ўваходзіць у лік такіх шчаслівеўцаў. Дзяўчына па праграме студэнцкага абмену вучылася ў Паўднёвай Карэі.**

Карэйскую мову Ганна вывучае ўжо два гады. Тры семестры — у Беларусі, у школе імя караля Сяджона, і адзін — у карэйскім універсітэце Кукмін. «Пры жаданні кожны можа вывучыць яе. Спачатку было крыху складана, але потым я пачала глядзець карэйскія кінафільмы, слухаць карэйскую музыку. Стала лягчэй усё ўспрымаць, — расказвае дзяўчына. — Да паездкі амаль не карысталася карэйскай мовай, таму што не было з кім размаўляць. А калі прыехала ў Сеул, то ў першы ж дзень трэба было вырашаць шмат бытавых пытанняў. Прыйшлося загаварыць. І вучыць патрэбна было ўсё вельмі хутка. Цяпер я ўжо магу падтрымаць размову».

Паехаць па абмене дзяўчыне прапанавалі выкладчыкі карэйскай мовы. Галоўнае патрабаванне — добрая вучоба. Ганна і яшчэ адна дзяўчына з БДУ жылі ў Сеуле. Іншыя — у другім горадзе. Праграма абмену займае шэсць месяцаў.

— Перад пачаткам семестра даводзіцца выбіраць прадметы, якія будзеш вывучаць, — пяць-шэсць дысцыплін. У спісе таксама ўказана мова, на якой будзе чытацца прадмет. «Калі студэнт адчувае ў сабе сілы, то можа выбраць усе прадметы на карэйскай. У мяне былі і на карэйскай мове, і на англійскай, — расказвае Ганна. — Трэба здаваць два пісьмовыя экзамены. Першы — у сярэдзіне семестра і другі — у канцы. Наведванне — вельмі важнае. А яшчэ няма размяжоўвання на лекцыі і семінары. У карэйскім універсітэце навучанне вядзецца пераважна ў форме лекцый. Бывае, што трэба напісаць міні-тэст або падрыхтаваць прэзентацыю. Апошняя работа — абавязковая ў групе. Увогуле, увесь працэс навучання скіраваны на пашырэнне сувязей, таму кожны раз аказваешся ў кампаніі новых студэнтаў.



У цэнтры Сеула. «Тондэмун» у перакладзе азначае «вялікія паўднёвыя вароты». Адзін з сімвалаў горада.

Дзяўчына жыла ў інтэрнаце. У пакоі было чатыры чалавекі: дзве беларускі і дзве манголкі. «Цікавых сітуацый было шмат, — успамінае студэнтка. — Здаралася, што на вуліцы да нас маглі падысці карэйскія дзяўчаты і пачаць размаўляць на англійскай мове, а калі даведваліся, што мы размаўляем на рускай, то таксама пераходзілі на яе».

Арыентавацца ў мегаполісе проста. Усё дзякуючы таму, што бясплатны інтэрнэт даступны ў любым месцы Сеула. Можна загрузіць карту ці знайсці іншую карысную інфармацыю.

Асобна трэба сказаць пра ежу. Карэйская — вельмі вострая. «Ад яе кідае ў пот, чырванее твар. Аднаго разу мы заказалі нявострыя такпокі (традыцыйная карэйская страва з рысавай мукі). Некалькі разоў паўтарылі, каб прынеслі менавіта такія. У выніку гэтыя такпокі нам прыйшлося запіваць вялікай колькасцю вады, таму што здавалася, быццам поласць рота нечым апякло», — успамінае Аня. Яшчэ адна адметнасць — мяса ў крамах прадаецца не кілаграмамі, а грамамі, таму што вельмі дорага каштуе. У рэстаранах, напрыклад, мяса смажаць не на кухні, а за тваім столікам. Можна і самому гэта зрабіць, калі ёсць жаданне.

— Уражанні ад Паўднёвай Карэі ў мяне засталіся самыя прыемныя. Чужая культура — гэта заўсёды цікава. Напрыклад, у карэйскім метро ёсць спецыяльныя месцы для пажылых людзей, іх ніхто і ніколі не займае. А вось у аўтобусе бабулі або дзядулю рэдка калі ўступяць месца, — дзеліцца сваімі назіраннямі Ганна.



Ганна Васілеўская каля палаца Кёнбокун.

— Таксама нам удалося пабываць на традыцыйнай цырымоніі пахавання, дакладней, на яе гістарычнай рэканструкцыі. Удзельнікі ў нацыянальных касцюмах паказвалі сцэну пахавання карэйскага манарха. Гэта на самай справе маштабная падзея. Мне было вельмі цікава.

**Марына ЛЯШКЕВІЧ,**
**студэнтка V курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**